УДК 94(476) “19”

# САЦЫЯЛЬНАЯ МАБІЛІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА Ў ГОД “ВЯЛІКАГА ПЕРАЛОМУ”

***А. А. Гужалоўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь huzhalous-ki@gmail.com*

У артыкуле даецца аналіз мабілізацыі беларускага савецкага грамадства ў 1929 годзе, які ўвайшоў у савецкую гісторыя як год «вялікага пералому». Разглядаюцца такія формы грамадскай мабілізацыі як вылучэнне рабочых і сялян на кіруючыя пасады, стварэнне атрадаў «лёгкай кавалерыі», ваенізацыя, развіццё фізкультурнага руху і барацьба з алкагалізмам. Робіцца выснова аб эфектыўнасці дадзенай сацыяльнай палітыкі толькі ў кароткатэрміновай пэрспэктыве.

***Ключавыя словы:*** *сацыяльная мабілізацыя, вылучэнцы, “лёгкая кавалерыя”, ваенізацыя, фізічная падрыхтоўка*

# СОЦИАЛЬНАЯ МОБИЛИЗАЦИЯ БЕЛОРУССКОГО СОВЕТСКОГО ОБЩЕСТВА В ГОД «ВЕЛИКОГО ПЕРЕЛОМА»

***А. А. Гужаловский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, huzhalouski@gmail.com*

В статье дается анализ мобилизации белорусского советского общества в 1929 году, вошедшем в советскую история как год «великого перелома». Рассматриваются такие формы общественной мобилизации как выдвижение рабочих и крестьян на руководящие должности, создание отрядов «легкой кавалерии», военизация, развитие физкультурного движения и борьба с алкоголизмом. Делается вывод об эффективности данной социальной политики лишь в кратковременной перспективе.

***Ключевые слова:*** *социальная мобилизация; выдвиженцы; «легкая кавалерия»; военизация; физическая подготовка.*

# INTRODUCTION OF SCIENTIFIC ACHIEVEMENTS OF DEPARTMENT TO EDUCATIONAL PROCESS OF BSU (CASE OF DISCIPLINE «HISTORY OF ENTREPRENEURSHIP IN BELARUS»)

***A. A. Huzhalouski***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, huzhalouski@gmail.com*

The article gives an analysis of the mobilization of Belarusian Soviet society in 1929, which went down in Soviet history as the year of the “great turning point”. Such forms of social mobilization are considered as the promotion of workers and peasants to leadership positions, the creation of "light cavalry" detachments, militarization, the development of a physical culture movement and the fight against alcoholism. The conclusion is drawn about the effectiveness of this social policy only in the short term.

***Key words:*** *social mobilization; political appointees; “light cavalry”; militarization; physical training.*

Пачынаючы з 1929 г., разам з з канцэнтрацыяй ва ўласных руках усіх рэсурсаў, неабходных для эканамічнага і сацыяльнага развіцця, дзяржава ўзяла на сябе адказнасць за сферу задавальнення надзённых патрэб людзей. Рэалізоўвалася патэрналісцкая мадэль сацыяльнай палітыкі, якую венгерска-амерыканскі эканаміст Я. Корнаі вызначыў як «адказнасць цэнтральнага кіраўніцтва за эканамічнае развіццё з аднадачасовым выкарыстаннем любых мэтазгодных, на яго погляд, адміністрацыйных сродкаў» [8, с. 586]. Адным з найважнейшых прынцыпаў патэрналісцкай сацыяльнай палітыкі, якія распрацоўваліся ў бліжэйшым атачэнні Сталіна, з’яўляўся эгалітарызм – роўнасць у скарыстанні матэрыяльных даброт і паслуг. На яго падмурку ў БССР была ліквідавана непісьменнасць, палепшаны жыллёвыя ўмовы тысячаў людзей, зніжана захворвальнасць, павялічылася працягласць жыцця.

Патэрналісцкая сацыяльная палітыка ў сталінскім СССР дапаўнялася надзвычайным, мабілізацыйным рэжымам функцыянавання палітычнай сістэмы і жыцця грамадства. На думку А. В. Хлеўнюка, цэнтральным суб’ектам усіх мабілізацыйных імпульсаў з’яўляўся Сталін [21, с. 348]. Ён санкцыянаваў, дазіраваў і накіроўваў усе асноўныя мабілізацыйныя кампаніі, як гэта было, напрыклад, з увядзеннем у 1929 г. бесперапыннага пяцідзённага тыдня. Сутнасць гэтага новаўвядзення, якое атрымала назву «савецкага рэвалюцыйнага календара» і

праіснавала да 1931 г., было ў замене звычайнага 7-дзённага тыдня на 5-дзённы з адным, шостым выходным днём. Пры гэтым працягласць працоўнага дня скарачалася з 8 да 7 гадзін. Такім чынам, ліквідаваліся прастоі станкоў у суботу і нядзелю, што ўздымала інтэнсіўнасць іх выкарыстання амаль на 30%. Пры гэтым у працоўных скараціўся час выходных – калі раней два выходных дні прыпадалі на 7-дзённы цыкл, то цяпер – на 10-дзённы.

Адным з сімвалаў сацыяльнай мабілізацыі былі т. зв. «вылучэнцы» – рабочыя і бяднейшыя сяляне, высунутыя на адказныя пасады ў органах дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання. Узняўшыся дзякуючы сацыяльным чысткам, без прафесійнай адукацыі і адміністрацыйнага вопыту, яны лёгка рабіліся аб'ектам маніпулявання, масіраванай прапаганды і спрыялі ўмацаванню таталітарнага рэжыма. Пра факты вылучэння рабочых і сялян на кіруючыя пасады з задавальненнем паведамляла прэса.

Напрыклад, 20 сакавіка 1929 г. на агульным сходзе рабочых і служачых мінскай шпалернай фабрыкі імя В. В. Вароўскага на пасаду намесніка дырэктара фабрыкі быў вылучаны рабочы машынна-друкарнага аддзяленьня Негнявіцкі [3, с. 4]. 10 жніўня таго ж году рабочага дражджавога заводу «Чырвоная зара», які з'яўляўся сакратаром заводскай партячэйкі, Беларускі камітэт саюзу харчавікоў вылучыў на пасаду дырэктара мінскай цукернай фабрыкі «Прагрэс» [19, с. 4]. У верасні гомельскага рабочага-чыгуначніка П. Саламонава прызначылі адразу на дзве пасады – начальніка Галоўсацстраху і намесніка наркама працы БССР [4, с. 4]. Але найвышэйшы кар'ерны рост у гады першай пяцігодкі зрабіла ураджэнка Віленскай губерні А. К. Марусевіч. У 1929 г. 30-гадовая, але ўжо з 14-гадовым стажам працы, ткачыха віцебскай фабрыкі «Дзвіна» была абрана старшынёй цэнтральнага праўлення прафсаюзу тэкстыльшчыкаў, неўзабаве яе абралі членам ЦК КП(б)Б, потым членам ЦВК БССР, і, нарэшце, у красавіку 1931 г. прызначылі наркамам сацыяльнага забеспячэння БССР [6, с. 4].

Да канца 1929 г. акруговыя выканаўчыя камітэты БССР вызначылі па некалькі дзясяткаў кіруючых пасад, на якіх мусілі працаваць выключна «вылучэнцы» з рабочых, калгаснікаў, батракоў. У шэрагу выпадкаў вылучэнне на гэтыя пасады мела калектыўны характар. Так, Цэнтральнае праўленне саюзу працаўнікоў зямлі і лесу Беларусі вылучыла звыш 2 тыс. рабочых на гаспадарчую, савецкую і саюзную работу. З іх 300 чалавек накіравалі ў савецкі апарат, 1000 чалавек – на адмінінстрацыйна-гаспадарчую працу, 500 чалавек – у сельгаскааперацыю, 300 чалавек – на прафсаюзную працу. Акрамя таго, больш 150 батракоў, пастухоў і рабочых саўгасаў занялі пасады старшынь і сакратароў сельсаветаў [22, с. 4].

«Вылучэнцы» на новых пасадах, як правіла, сутыкаліся з вялікімі праблемамі. Напрыклад, пасля прызначэння «вылучэнцаў» загадчыкамі большасці цэхаў на рэчыцкай запалкавай фабрыцы «Дняпро», дзейнасць прадпрыемства была фактычна паралізавана. Новыя загадчыкі не маглі арганізаваць вытворчы працэс у начныя змены, рэзка павялічыўся аб'ём бракаванай прадукцыі, невырашальную праблему ўтварала нават забеспячэнне рабочых анучамі для чысткі машын [7, с. 4]. З мэтай аказання дапамогі «вылучэнцам», пры акруговых выканкамах ствараліся адмысловыя курсы, дзе асноўная ўвага надавалася іх палітычнаму выхаванню. У канцы 1929 г. цэнтральныя курсы для «вылучэнцаў» адкрыліся пры ЦК КП(б)Б у Мінску [5, с. 3].

У авангард сталінскіх мабілізацыйных кампаній, якія адразу ж набылі інтэнсіўны і агрэсіўны характар, была пастаўлена моладзь. У 1929 г. у працэсе зрошчвання партыйнага, савецкага і прафсаюзнага апарата, камсамол усё актыўней уключаўся ў працу дзяржаўных органаў. Так было падчас хлебанарыхтоўчых кампаній, калектывізацыі, раскулачвання і найбольш відавочна – у дзейнасці атрадаў «лёгкай кавалерыі». Гэта былі групы камсамольцаў-актывістаў, створаных пры камітэтах камсамола прадпрыемстваў і ўстаноў. Рух «лёгкай кавалерыі» набыў масавы характар са снежня 1928 г., калі ЦКК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ выдалі цыркуляр «Аб групах "лёгкай кавалерыі"». У якасці галоўных задач «кавалерыстаў» аўтары цыркуляра вызначылі: барацьбу з бюракратызмам і безгаспадарнасцю ў дзяржаўным, гаспадарчым, кааператыўным і прафсаюзным апараце, кантроль за ўдарнымі будоўлямі, хлебанарыхтоўкай, гандлем і забеспячэннем [13, с. 252–254].

У БССР кампанія па разгортванні руху «лёгкай кавалерыі» пачалася ў лютым 1929 г. [2, с. 2] Яе першыя вынікі былі падсумаваны 21 красавіка таго ж году на агульнагарадскім злёце мінскіх «кавалерыстаў», дзе прысутнічала каля 200 чалавек. Перад прысутнымі на злёце была пастаўлена задача: узяць чынны ўдзел у чыстцы савецкага апарата рэспублікі. У якасці прыкладу для астатніх, на злёце была прыгадана

першая гучная акцыя беларускіх «кавалерыстаў». Напачатку сакавіка 1929 г. яны наладзілі публічнае абгаварэнне пропуску ў друк «Правапісу» Я. Лёсіка з фіктыўным галоўлітаўскім нумарам, які паставіў на гранках тэхнічны рэдактар Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, «былы афіцэр» Пуроўскі. У выніку гатовы наклад «Правапісу» быў забаронены для распаўсюду і скарыстаны ў якасці абгортачнай паперы [9, с. 4].

Адной з найбольш распаўсюджаных форм актыўнасці «лёгкай кавалерыі» былі так званыя «налёты». У тых месцах, дзе меркаваўся «налёт», вывешваліся скрыні для скаргаў, дзе кожны мог пакінуць падпісанае альбо ананімнае паведамленне пра безгаспадарчае кіраванне, нізкую вытворчасць працы альбо варожае сацыяльнае паходжанне саслужбоўца. Праз нейкі час з'яўляўся атрад «лёгкай кавалерыі», які ў загадным парадку патрабаваў усю справаводчую і бухгалтарскую дакументацыю, апытваў супрацоўнікаў і навакольных жыхароў аб працы дадзенай установы. Пасля абмеркавання вынікаў «налёта» на сходзе камсамольскай ячэйкі, яго вынікі перадаваліся ў рабоча-сялянскую інспекцыю для правядзення карных санкцый. У пэўных выпадках рабоча-сялянская інспекцыя выступала ініцыятарам «кавалерыйскіх налётаў».

Напрыклад, напрыканцы красавіка 1929 г. бюро скаргаў рабоча-сялянскай інспекцыі наладзіла «налёт» на медычныя ўстановы Мінскага атраду «лёгкай кавалерыі», які складаўся з камсамолак-медсёстраў і сябраў гурткоў Чырвонага крыжу. Шакаванаму медперсаналу «кавалерысты» тлумачылі свае з'яўленне неабходнасцю праверкі скаргаў на фармальныя і грубыя адносіны дактароў да хворых [15, с. 4]. У ноч з 14 на 15 кастрычніка таго ж году транспартная група рабоча-сялянскай інспекцыі арганізавала «начны налёт» камсамольцаў-чыгуначнікаў і журналістаў газеты «Рабочы» на мінскі чыгуначны вузел [14, с. 3]. Разуменне значнасці выконваемай задачы дапаўнялася поўнай некампетэнтнасцю «кавалерыстаў» у дзейнасці правяраемых устаноў, што прыводзіла да яе пагаршэння, і, нават, дэзаранізацыі.

У год вялікага пералому, разам з развіццём ваеннай прамысловасці і стварэннем шматлікага, баяздольнага войска, Сталін распачаў ваенізацыю ўсяго грамадства. Будаўніцтва кадравага войска было павінна ісці пры ўсенароднай падтрымцы. Толькі ў верасні 1929 г. на абарону краіны ў сталіцы БССР ахвяравалі: металісты завода «Камунар» – 287 руб., абутковая фабрыка – 428 руб., шпалерная фабрыка – 300 руб., саюз працасветы – 566 руб., харчавікі – 464 руб., працаўнікі мастацтва – 212 руб., сельгасрабочыя – 608 руб., саюз медсанпрацы – 176 руб., саюз чыгуначнікаў – 1 147 руб. Акрамя безадраснай дапамогі «на абарону краіны», праводзіліся мэтавыя акцыі па збіранні сродкаў, напрыклад на будаўніцтва самалёта «Чырвоны партызан Беларусі» [20, с. 3]. 23 лютага 1929 г. з мэтай «набліжэння» да РСЧА адбыўся масавы паход мінскага студэнцтва ў казармы дыслакаваных у ваколіцах горада чырвонаармейскіх частак [10, с. 4]. Вайна з геапалітычнай падзеі паступова ператваралася ў інструмент падтрымання ў структурах улады і грамадстве ў цэлым мабілізацыйнага стану. Разам з адкрытымі заклікамі ў друку рыхтавацца да абарончай вайны з Польшай [16, с. 2], у рэспубліцы актыўна праводзіліся ваенна-спартовыя мерапрыемствы, вучэнні па абароне ад паветраных і хімічных атак, вайсковая справа ўводзілася ў праграмы навучальных устаноў.

Адным з найважнейшых фактараў баяздольнасці арміі заўсёды з'яўлялася фізічная падрыхтоўка вайскоўцаў. З 1929 г. партыйнае кіраўніцтва БССР абавязала камсамол разгарнуць актыўную працу па фізічным выхаванні моладзі як складанай часткі павышэння абараназдольнасці краіны. На сакавіцкім (1929) пленуме Вышэйшага савета фізкультуры Беларусі канстатавалася наяўнасць у рэспубліцы ўжо 121 тыс. фізкультурнікаў [23, с. 3]. Выкананне пастаўленай Сталіным у 1929 г. задачы суцэльннай калектывізацыі сялянскай гаспадаркі не перашкодзіла правесці першую Усебеларускую вясковую спартакіаду, у якой удзельнічалі лепшыя з 7 тыс. калгасных фізкультурнікаў [12, с. 4].

Адначасова ў Савецкай Беларусі была разгорнута барацьба з празмерным ужываннем спіртных напояў – з'явай, якая пагражала перакрыжаваць усе высілкі па сацыяльнай мабілізацыі насельніцтва. На першай канферэнцыі па барацьбе з алкагалізмам, якая прайшла ў Мінску ў студзені 1929 г. прагучалі шакуючыя лічбы: калі ў 1925/26 аперацыйным годзе у БССР было выпіта 250 тыс. вёдзер гарэлкі, то ў 1927/28 – 899 тыс. вёдзер [17, с. 3]. У сакавіку 1929 г. паўстаў Усебеларускі камітэт па барацьбе з алкагалізмам, які меў аддзяленні ў раёнах. Камітэт распрацаваў праект, што абмяжоўваў продаж алкаголю і адначасова пашыраў антыалкагольную прапаганду.

Асаблівую ўвагу планавалася надаць буйным рабочым пасёлкам, дзе значная частка мужчынскага насельніцтва злоўжывала спіртным [18, с. 4].

Мабілізацыйнае становішча моладзі былі закліканы падтрымліваць новыя працоўныя ініцыятывы па рэалізацыі сталінскай ідэі «вялікага скачка». Увесну 1929 г. моладзь БССР адправілася ў «паход» за другаснай сыравінай – жалезным ломам, макулатурай, косткамі і попелам. Апошняму віду сыравіны надавалася асаблівая ўвага, бо яна выкарыстоўвалася для павышэння ўраджайнасці калгасных палёў. Вось як «паход» з удзелам 500 камсамольцаў і піянераў праходзіў у Бубруйску: «З кошыкамі, скрынкамі, вёдрамі, мяшкамі ўдзельнікі паходу абыходзілі ўсе дамы гораду, установы і зьбіралі попел. Па горадзе раз'язджалі фурманкі, грузавы аўтамабіль, яны адвозілі попел на ссыпныя пункты, якіх было арганізавана 6 ва ўсіх канцох гораду. Гэты першы паход даў каля тысячы пудоў попелу, які пойдзе на ўгнаеньне палёў» [1, с. 3]. На працягу 4 дзён з 28 па 31 кастрычніка 1929 г. мінскія школьнікі і студэнты – сябры Міжнароднага таварыства дапамогі рабочым сабралі 2 тыс. мяхоў для адгрузкі ў Маскву і Ленінград «чырвоных эшалонаў» бульбы [11, с. 4].

Сацыяльная мабілізацыя беларускага грамадства дала пэўныя вынікі ў справе дасягнення канкрэтных мэтаў, але ў доўгатэрміновай перспектыве справакавала яшчэ больш глыбокія і сістэмныя крызысы інстытутаў улады і грамадства.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бабруйскія камсамольцы сабралі за дзень 1000 пудоў попелу // Зьвязда.1929. 2 крас. № 73.
2. Белагорскі В. «Лёгкая кавалерыя» на полі баёў / В. Белагорскі // Зьвязда. 1929. 24 лют.
3. Вылучэньне рабочых на адказную работу // Зьвязда. 1929. 31 сак.
4. Зьвязда. 1929. 13 верас.
5. Зьвязда. 1929. 17 снеж.
6. Зьвязда. 1931. 2 крас.
7. Каробачны. «Дробязі» // Зьвязда. 1931. 5 студз.
8. Корнаи Я. Дефицит М.: Наука, 1990.
9. «Лёгкая кавалерыя». Паперу, грошы на вецер. Шкоднікі ў БДВ // Зьвязда. 1929. 28 сак.
10. Масавы паход у Чырвоныя казармы // Зьвязда. 1929. 23 лют.
11. Мопраўцы ў паход па мяшкі // Зьвязда. 1929. 30 кастр.
12. М. Ц. 17 жніўня Усебеларуская вясковая спартакіяда // Зьвязда. 1929. 15 жн.
13. Наследникам революции. Документы партии о комсомоле и молодежи. М., 1969.
14. «Налёт» на Менскі чыгуначны вузел // Зьвязда. 1929. 18 кастр.
15. «Налет» РСІ на мэдычныя ўстановы // Зьвязда. 1929. 26 крас.
16. Папоў Б. Падрыхтоўка польскага фашызму да нападу на СССР // Зьвязда. 1929. 7 вер.
17. Першая канфэрэнцыя па барацьбе з алкагалізмам // Зьвязда. 1929. 29 студз.
18. Продаж гарэлкі будзе абмежаваны // Зьвязда. 1929. 18 крас.
19. Рабочы – дырэктар фабрыкі «Прагрэс» // Зьвязда. 1929. 11 жн.
20. Рабочыя Менску – на абарону краіны // Зьвязда. 1929. 3 кастр.
21. Хлевнюк О. В. Хозяин: Сталин и утверждение сталинской диктатуры. М.: РОССПЭН, 2010.
22. 2.000 батракоў і с.-г. рабочых вылучаюцца на адказную працу // Зьвязда. 1929. 14 крас.
23. 121 000 фізкультурнікаў у БССР // Зьвязда. 1929. 21 сак.


УДК 342.023(476)(06)

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ: АСОБНЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЯРЖАЎНАГА РЭГУЛЯВАННЯ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***А.Л.Дашкевіч***

*Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці, вул. Серафімовіча, 11, 220033, г.Мінск, Беларусь, lad-minsk@mail.ru*

Разглядаюцца асобныя аспекты трансфармацыі дзяржаўнага рэгулявання дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў. Аўтарам вызначаецца шэраг асаблівасцей гэтага працэсу ва ўмовах станаўлення і развіцця Рэспублікі Беларусь на падставе рэтраспектыўнага вывучэння канстытуцыйнага заканадаўства.

***Ключавыя словы:*** *грамадскія аб'яднанні; дзяржаўнае рэгуляванне; канстытуцыйнае заканадаўства.*